рэднікаў, пры гэтым акцёрскае майстэрства стала больш дасканалым.

Вялікую стваральную дзейнасць распачалі Ф.Аляхновіч, Ф.Ждановіч, У.Галубок, Е.Міровіч. Іх дзейнасць на ніве беларускага тэатра высакародная. Беларускі тэатр стаў высокапрафесійным. К.Саннікаў, Л.Літвінаў працавалі ў змрочны час. Геаграфія беларускага тэатра была звужана да мінімуму. Б.Эрын, В.Раеўскі, Б.Луцэнка, В.Маслюк, В.Мазынскі, Р.Баравік зберaглі зробленае папярэднікамі, але, на жаль, не пашырылі геаграфію беларускага драматычнага тэатра.

Новы час - час нашых выпрабаванняў. Мы, выкладчыкі арганізацыі тэатральнай творчасці, павінны зрабіць многае дзеля ўзбагачэння традыцый беларускага тэатра.

Шаура Р.Ф.,
канд. мастацтвазнаўства,
дацэнт

## МЕСЦА І РОЛЯ СПЕЦЫЯЛІСТА НАРОДНЫХ РАМЁСТВАЎ У РАЗВІЦЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

На шляху выхавання чалавека, фарміравання яго як асобы значная роль належыць мастацтву наогул і народнаму ў прыватнасці. Прыцягненне чалавека да мастацтва садзейнічае развіццю і фарміраванню яго агульнай культуры, што ў сваю чаргу абагачае і стымулюе яго грамадскую і творчую актыўнасць і ўсю сацыякультурную дзейнасць.

Народнае мастацтва як неад`емная частка духоўнага жыцця народа заўсёды было і застаецца вельмі блізкім і зразумелым кожнаму чалавеку, паколькі яго стваральнікам з`яўляецца сам народ. Укаранёнае глыбока ў жыцці, яно заўсёды звязана з асаблівасцямі яго ўкладу, абумоўлена гістарычнымі прычынамі развіцця грамадства. Народнае мастацтва неадрыўна ад утылітарна-функцыянальных бакоў існавання чалавека, што абумоўлівала істотную патрэбу ў ім ў паўсядзённым жыцці.

Мы ведаем, што народнае мастацтва як частка агульнай духоўнай культуры бытавала і бытуе сёння ў разнастайных формах. Адну з першых форм можна вылучыць як індывідуальна-родавую, якая захоўвае свой этнічны ўклад, жывую культурную памяць аб традыцыях пэўнага месца ці ўсяго рэгіёна. Народнае мастацтва жыло і развівалася не як вынік калектыўнай працы майстроў, не як абагульненая сістэма вобразнага светаўспрымання, а больш як індывідуалізаваная форма мастацкай дзейнасці, абмежаваная рамкамі сямейна-родавых адносін людзей.

Другой формай развіцця народнага мастацтва з`яўляецца калектыўная творчасць. Яна прадугледжвае пэўную колькасць майстроў, аб`яднаных у промысел на аснове мясцовых традыцый, звычак, наяўнасці адпаведных умоў, сыравіны і г.д. Існаванне такога промыслу залежыць ад попыту на вырабы, магчымасці рэалізацыі іх на рынку, наогул ад жыццёвай патрэбы ў пэўных рэчах народнай творчасці.

Да трэцяй формы развіцця народнага мастацтва можам аднесці арганізаваную дзейнасць майстроў, спецыялістаў у рамках дзяржаўных прадпрыемстваў (спецыяльных майстэрань, фабрык, творчых аб'яднанняў). Тут галоўная ўвага надаецца менавіта вытворчаму працэсу як асноўнай рухаючай сіле існавання такога роду прадпрыемства.

Названыя і іншыя формы існавання народнага мастацтва не адасоблены нейкімі жорсткімі рамкамі паміж сабой. Яны маюць шэраг разнастайных напрамкаў у сваім развіцці, якія аб`ядноўваюць іх, садзейнічаюць устанаўленню цеснай сувязі паміж імі. Таму вельмі важна, каб усім працэсам захавання і далейшага развіцця народнага мастацтва маглі кіраваць кваліфікаваныя спецыялісты ў гэтай галіне.

Беларускі універсітэт культуры ўжо на працягу чатырох гадоў рыхтуе будучых спецыялістаў па народных рамёствах. Спецыялісты з вышэйшай адукацыяй у сферы народнага мастацтва павінны не толькі прафесійна валодаць уменнямі і навыкамі ў тым ці іншым відзе творчасці, але і ўмець арганізаваць творчы працэс, стварыць працаздольны калектыў, накіраваць яго на правільны, навукова абгрунтаваны шлях у адраджэнні і далейшым развіцці народнага мастацтва. У гэтым сэнсе мадэль спецыяліста -- арганізатара народных рамёстваў, кіраўніка калектыву, педагога і выхавацеля -- не павінна быць абмежавана вузкім колам прафесійнай дзейнасці.

Якая ж роля і якое месца павінен займаць спецыяліст ў далейшым развіцці народнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва, агульнай мастацкай культуры? Спектр яго дзейнасці можа быць даволі шырокім. Улічваючы разнастайнасць форм існавання народнага мастацтва, спецыялісты павінны ўключыцца ў працэс па стварэнні і арганізацыі дзейнасці дамоў народных рамёстваў, якія могуць быць вучэбна-вытворчымі структурамі ў галіне народнага мастацтва і метадычна-кансультацыйнымі пунктамі па вывучэнні, засваенні і развіцці ў сучасных умовах разнастайных відаў народнага рамяства.

Як арганізатары і метадысты будучыя спецыялісты павінны адыграць пэўную ролю ў стварэнні школ маладых майстроў (як, напрыклад, школа маладых ткачых сяла Неглюбкі Гомельскай вобласці), запрашаць да працы вядомых майстроў, прызнаных умельцаў у галіне народнага мастацтва. Сёння, як ніколі, патрэбна жывая, творчая сувязь майстроў старэйшага пакалення з моладдзю.

Улічваючы тыя абставіны, што будучыя спецыялісты могуць карыстацца правам выкладання ў агульнаадукацыйных і спецыяльных школах, прадстаўляецца магчымасць уключыцца ў працэс эстэтычнага выхавання школьнікаў на прыкладах народнага мастацтва як на ўроках, так і на факультатывах ці ў спецыяльных творчых гуртках.

Выступаючы ў ролі метадыстаў па народнаму мастацтву пры абласных дамах народнай творчасці, спецыялісты павінны весці вельмі адказную работу з народнымі майстрамі, самадзейнымі мастакамі, дапамагаць ім у творчым працэсе, кваліфікавана кіраваць працэсам у адраджэнні і захаванні традыцый, арганізоўваць выставачную і камерцыйную дзейнасць.

У полі прафесійнай дзейнасці спецыялістаў павінна таксама заставацца і навукова-даследчая дзейнасць па зборы і сістэматызацыі матэрыялаў па народнаму мастацтву, папулярызацыя творчасці народных майстроў праз сродкі друку, радыё, тэлебачанне.

Можна было б назваць іншыя накірункі, дзе могуць і павінны прыкладваць намаганні і рэалізоўваць свае прафесійныя навыкі будучыя спецыялісты, але гэта не сама мэта. Важна тое, каб яны знайшлі сваё месца на шляху адраджэння і далейшага развіцця нацыянальнага народнага мастацтва.

Агафонава Н.А.,
канд.мастацтвазнаўства,
выкладчык

## КУРС "ГІСТОРЫЯ СУСВЕТНАГА КІНО" І ЯГО МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

Кіно ў параўнанні з традыцыйнымі відамі мастацтва шырока распаўсюджана, мае вялікае кола прыхільнікаў. Тым не менш гэта звонку лёгкае для ўспрымання мастацтва фактычна застаецца невядомым. Як паказала анкетаванне (верасень 1992 г.), студэнты творчых спецыяльнасцей могуць назваць толькі 2 - 3 прозвішчы майстроў кінарэжысуры: Ф.Феліні, А.Таркоўскі, Э.Разанаў. Пры тым пераважная большасць рэспандэнтаў не здолелі назваць пастаўленыя імі фільмы. Увогуле апытанні і размовы са студэнтамі ў працэсе выкладання гісторыі кіно прыводзяць да вываду, што экран застаецца своеасаблівым атракцыёнам, сродкам забавы і адпачынку для маладых гледачоў. Дарэчы, сучасны кінапаток, які грунтуецца на таннай амерыканскай прадукцыі, замацоўвае такое становішча.

Таму навучальны курс "Гісторыя сусветнага кінамастацтва" носіць не толькі прыкладны характар, але мае агульнаадукацыйны, агульнавыхаваўчы патэнцыял. Адсюль паўстае шэраг метадычных праблем. І перш за ўсё - распрацоўка навучальнай праграмы.

Гісторыя сусветнага кінамастацтва - новая дысцыпліна. Дагэтуль на факультэце мастацкай творчасці выкладалася гісторыя савецкага кіно. Абмежаваная колькасць гадзін (24) не дазваляла падрабязна разглядаць працэс мастацкага станаўлення кінематографа. Трэба было згрупаваць у жорсткую сістэму шматлікі гістарычны, фактычны, праблемны матэрыял і падаваць яго ў пэўнай лагічнай паслядоўнасці.

У выніку рознабаковага асэнсавання склалалася канцэпцыя праграмы курса. Яна ахоплівае адзіны працэс развіцця кінамастацтва з моманту яго ўзнікнення ў 1895 г. да сучасных дзён і грунтуецца на трох узаемаабумоўленых аспектах: этапы, стылі, майстры.

Першы этап развіцця кінамастацтва мае дакладныя межы: 1895-1930 гг.,ад вынаходства дынамічнага адлюстравання да авалодання гукам. Тут галоўная ўвага засяроджваецца на 20-х гг., калі з'явіліся моцныя творчыя плыні ў